*Калнін В. В.*

# ЯК НЕ ТРАПІЦЬ У ПАСТКУ ПРЫ МІРСКІМ ЗАМКУ[1]

На канферэнцыі, якая адбылася ў Мірскім замку ў чэрвені 2009 г., выступіў малады навуковец Мікола Волкаў з дакладам «Брама Мірскага замка як абарончы вузел: пытанне аб існаванні герсы і пад'ёмнага моста». Тады ж, на канферэнцыі, я выказаў некалькі крытычных заўваг да высноў дакладчыка. У выніку слоўнай палемікі кожны застаўся пры сваіх меркаваннях. Трэба было дачакацца друкаванага тэксту.

Ён з'явіўся ў першым нумары «Беларускага гістарычнага часопіса» за 2012 год пад загалоўкам «Фартыфікацыя і ўзбраенне Мірскага замка». У тэксце прадстаўлены багаты матэрыял на падставе вывучэння навуковай літаратуры, архіўных дакументаў, уласныхназіранняў.

Аўтар слушна падкрэслівае ўзаемную сувязь падзей у Мірскім і Нясвіжскім замках пры Радзівілах. Слушна адзначана першынство Мірскага замка як галоўнай рэзідэнцыі князя Сіроткі. Пры гэтым выказана цікавая думка пра абарончую прычыну пераноса галоўнай рэзідэнцыі ў Нясвіж з-за дасягальнасці Мірскага замка пры артылерыйскім агні з вельмі блізкага ўзвышша.

Добра прааналізаваны ў артыкуле віды агнястрэльнай зброі і дастасаванне яе да абарончай структуры Мірскага замка

Вельмі цікавыя звесткі падае аўтар пра падзеі 1656 г. Вядома, што ў верасні замак быў захоплены і разрабаваны казацкімі і расейскімі войскамі. Волкаў адзначае, што пра збройную абарону замкавага гарнізона звестак няма. Далей даволі падрабязна пададзены эпізод захопу замка жаўнерамі Багуслава Радзівіла ў снежні

[1] Рэдакцыйная калегія вырашыла надрукаваць у гэтым зборніку ў якасці навуковай палемікі даклад Валянціна Калніна, які быў напісаны ў чэрвені-ліпені 2013 г.

таго ж года. Праўда, не зусім зразумела пра «хітрасць», ужытую пры заняцці Нясвіжа і Міра, а таксама пра здраду нейкіх жаўнераў. На жаль, аўтар тут не падае цытатаў.

Аўтар адзначае, што пасля ваенных падзей XVII ст. Мірскі замак не здольны быў выконваць функцыі абарончага умацавання. Усувязі з гэтым варта пагадзіцца з высновай, што гаспадарчыя пабудовы звонку заходняй і паўдзённай сценаў з’явіліся пасля 1660 г. Даволі падрабязна і пераканаўча аўтар падае падзеі шведскага нашэсця 1706 г.

У заключэнні аўтар справядліва крытыкуе некаторыя рэстаўрацыйныя захады, якія пераўтварылі помнік у стылізаваную сядзібу XIX ст., асабліва яго акружэнне. Разам з тым у аўтара прасочваецца залішняя глорызацыя Мірскага замка як маніфэста (!?) фартыфікацыі дабастыённага часу, і што ён (замак) быў здольны эфектыўна процістаяць магчымым ворагам. Адносна працэса будаўніцтва замка аўтар робіць нелагічныя высновы. Напрыклад, узвядзенне спачатку вежаў, а потым сцен. Чаму ж тады паўночна-заходняя вежа засталася недабудаванай, а сцены ўжо былі? Тут аўтар аказаўся ў палоне практыкі ранняга сярэнявечча, калі звычайна спачатку ўзводзілі вежу-данжон і толькі потым нешта дабудоўвалі. На самой справе, першыя будаўнікі замка, кіруючыся простай логікай, спачатку клапаціліся пра завяршэнне вонкавага яго абводу, адкладаючы ўзвядзенне ўнутраных частак (палац, арсенал і інш.) на другі этап.



*Мал. 1.* ***Мірскі замак. Малюнак Б. Падчашынскага***


*Мал. 2.* ***Рэканструкцыя праезда брамы. Аўтар М. Волкаў***

Асобнае месца ў тэксце займае рашэне абароны брамы. Аўтар сцвярджае, што існаванне герсы ў браме — гісторыяграфічны міф, які не мае абгрунтавання а ні ў крыніцах, а ні ў аналагах. Волкаў прапаноўвае свой варыянт вырашэння гіпотэзы. Тут давядзецца прааналізаваць разважанні аўтара вельмі ўважліва.

Па-першае, быццам для паражэння «мёртвай зоны» перад самым уваходам у брамную вежу існавалі машыкулі на 3-м і 7-м паверхах вежы. Апошнія на 7-м паверсе аўтар убачыў на малюнку К. Русецкага з кнігі Ул. Сыракомлі «Вандроўкі па маіх колішніх ваколіцах». Але вядомы малюнак больш дакладны і больш ранні Балеслава Падчашынскага, дзе «быццам машыкулі» адпавядаюць дэкору з гіркамі, захаванаму да нашага часу.

Далей аўтар лічыць падоўжаную шырокую адтуліну над самым пачаткам праезда не шчылінай для герсы, а машыкулем. За гэтай шчылінай праезд быццам прыкрываўся падаючым мастом («узводам», як пазначана ў інвентарах Мірскага замка за 1681 і 1688 гг.). У пошуках апірышча гэтага меркаванага моста Волкаў ініцыяваў у 2010 г. раскоп ў браме пад кіраўніцтвам археолага А. Кушнярэвіча. У выніку замест апірышча было зроблена «адкрыццё» ямы-пасткі памерам 2,15×2,25 м і глыбінёй 2,5 м.

Пасля гэтага аўтар прадстаўляе рэканструкцыю ўсяго абарончага прыстасавання ў браме ў выглядзе трохмернай графікі. Дзеля

лепшага разумення я перадаю словамі сцэнарыі падзей, якія маглі б адбыцца пры рэалізацыі прапановы.

Варыянт 1-ы: пад’ёмны мост узняты і прыкрывае ўваход. Ворагі падыходзяць да моста і хочуць яго парушыць. Зверху на іх кідаюць камені і яны ўцякаюць. Канец сцэны. Аднак тут нешта не стасуецца. Мост для чаго, каб перакрыць яміну ці пратоку? Праз яміну ворагам трэба неяк пераскочыць, каб апынуцца каля ўзнятага моста. У згаданых вышэй інвентарах пра яміну нічога няма. Спачатку апісваецца поўкруглае прадбрам’е, унутры якога з левага боку вартоўня з дошак. Гэтыя інвентары – адзіныя дакументы, на якія спасылаліся і спасылаюцца ўсе даследчыкі брамы замка.

Варыянт 2-гі: пад’ёмны мост апушчаны. Ворагі праходзяць па мосце і скочуць у яму-пастку перад другімі варотамі. З таксванай «машыкулі» іх не дастаць. Ворагі , чапляючыся за апорныя бэлькі моста, выскокваюць з яміны і ўцякаюць. Але ж, нехта скажа, пакуль ворагі ў яміне, мост падымуць і яны ў палоне? Пытанне: на што ворагу скакаць з моста ў яміну? Канец сцэны.

Аўтар тэорыі моста, мабыць, неяк адчуваў, што тэорыя «не грае». Таму паведамляе, што ў часе складання інвентароў 1681 і 1688 гг. узвод быў неужываны, а ланцугі для яго пад’ёму абарваныя. У гэтым вывадзе праяўляецца схільнасць аўтара ў выпадку неразумення «абрываць» звёны лагічных ланцугоў. У інвентарах гаворыцца пра ўзвод, што яго «падымаюць і апушчаюць»: словы стаяць у цяперашнім часе, а не ў мінулым. Па-другое, нідзе не сказана, што ланцугі абарваныя, хоць надламаная паласа на ўзводзе адзначана. За жалезнымі вырабамі тады пільна сачылі і немагчыма ўявіць, каб ланцугі ляжалі без ужытку як мінімум 7 гадоў (час паміж складаннем інвентароў).

Самае дзіўнае, што ў разважаннях аўтара і на малюнках нічога няма пра сітуацыю канца XVII ст., быццам не існавала ні прадбрам’я, ні вартоўні ў ёй з левага боку. А галоўнае тут тое, што пры існаванні прадбрам’я ўзвод дзейнічаў і ў згаданых інвентарах падрабязна апісаны. Разгледзем апісанні крок за крокам. Найперш падаем фрагменты з арыгінальных тэкстаў.




*Мал. 3.* ***Разрэз і план брамы. Рэканструкцыя на XVII ст.***



*Мал. 5.* ***Фасад — узвод апушчаны***



*Мал. 4.* ***Разрэз — узвод апушчаны***



*Мал. 6.* ***Разрэз — узвод падымаюць***



*Мал. 7.* ***Пазухі ўздоўж шчыліны над праездам брамы. Фота з капліцы М. Волкава***

З інвентара 1681 г.

«Wiezdżaiąc do Zamku od Miasta Brama Murowana wpół okrągła Kamieniem szarym ciosanym wkoło Wrot wyfutrowana [...] Z tey Bramy wchodząc do drugiey murowaney wysklepioney na drugiey rozne mieszkania y Wieża z Zegarem, wzwód dębowy trzema żelaznymi Pasami wpoprzek spięty, a dwa pasy w końcu onego, tamże dwa końce łańcuchów, u iednego ogniów siedmnaście, a u drugiego szesnaście z kolcami, do tegoż wzwodu Kolca dwie w Murze kędy łańcuchy chodzili. Od tey Bramy drugie wrota dębowe dwoiste na biegunach».

«Пры ўездзе ў замак ад горада мураваная поўкруглая брама, абапал варот выкладзеная шэрым цясаным каменем. [...] Ад гэтай брамы ўваходзячы да другой мураванай са скляпеннем, на (гэтай) другой розныя памяшканні і вежа з гадзіннікам, узвод дубовы трыма жалезнымі пасамі ўпоперак сцягнуты, а два пасы ў канцы яго, там жа два канцы ланцугоў, у аднаго сямнаццаць звёнаў, а ў другога шаснаццаць з каламі, да таго ж узвода два калы ў муры, куды ланцугі заходзілі. Ад той брамы другія дубовыя падвойныя вароты на бегунах».

З інвентара 1688 г. больш падрабязна:

«Wchodząc do Zamku Reduta murowana, wrota dwoiste na biegunach z fortą goździami żelaznemi zbite, forta na zawiasach z prętem wielkim żelaznym do zamykania y zamki dwa przywiesiste. Po lewey stronie Kordygarda do muru przyrobiona z tarcic.[...] Wchodząc do Bramy, Wzwod stary, zbity Czterma pasy żelaznemi, z tych ieden pas nadłamany, u tegoż wzwodu łancuchy dwa, na dwuch kolcach z proboiami, w iednym łancuchu ogniw piętnaście, a w drugim szesnaście. W murze po obu stronach dwie kolca dębowe na dwuch prętach żelaznych na których wzwód podeymuią i spusczaią. W spodzie tego wzwodu ref dwie y szypy żelazne. Za tym wzwodem Wrota dębowe Stare dwoiste».

«Уваходзячы да замка мураваны рэдут, падвойныя вароты на бегунах з форткай [малымі дзверкамі – В.К.], абабітыя жалезнымі цвікамі, фортка на завесах з вялікім жалезным прутом для замыкання і двума навяснымі замкамі. Па левым баку вартоўня, прыробленая да муру з дошак. [Унутранае апісанне вартоўні мною апушчана — В.К.] Уваходзячы ў браму стары ўзвод, збіты чатырма

жалезнымі пасамі, з якіх адзін пас надламаны, ад таго ўзводу два ланцугі на двух калах з прабоямі (абушкамі), у адным ланцугу пятнаццаць звёнаў, а ў другім шаснаццаць. У муры па абодвух баках два дубовых кала на двух жалезных прутах, на якіх узвод падымаюць і спушчаюць. У нізе таго ўзводу дзьве рэфы (паласы) і жалезныя шыпы. За тым узводам старыя падвойныя дубовыя вароты».

Прааналізуем дадзеныя тэксты.

Сам узвод дубовы, перахоплены папярок жалезнымі палосамі (у інвентары 1681 г. пазначаны тры паласы, а ў 1688 г. — чатыры, адна з якіх надламаная). Да таго ж у абодвух інвентарах прапісаны дзве паласы ўнізе. Гэта азначае, што дубовы набор палатна ўзвода вертыкальны. Ужо толькі дадзеная абставіна выключае магчымасць моста. Покрыва драўляных мастоў складаюць з папярочных драўнін, інакш калёсы возоў ды капыты хутка павыбіваюць каляіны (гл. прыклад на выяве Аршанскай бітвы).

Яшчэ адна дэталь з апісання 1681 г.: пасля слоў «дзве паласы ў канцы таго [ўзвода — В.К.], там жа два канцы ланцугоў». Гэта азначае, што ланцугі мацаваліся да ўзвода ўнізе. Далей лагічна ідзе пералічэнне звёнаў ланцугоў, потым калы ў муры, дзе ланцугі праходзілі. У апісанні 1688 г. паўтараецца тая ж паслядоўнасць, толькі да калоў у муры дабаўлены жалезныя пруты, а да ўзвода ўнізе – жалезныя шыпы.

Ёсць адно адрозненне ў апісаннях абодвух інвентароў. У 1681 г. дзве ніжнія палосы названы палосамі («pasy»), а ў 1688 г. яны названы рэфамі («refy»), між тым, як верхнія — палосамі. Волкаў тлумачыць слова «рэфы» як пласціны (так яму патрэбна было для свайго моста). Згодна слоўніка С. Б. Ліндэ выраз refy нямецкага паходжання ад Reifen — абруч; кальцо. Хутчэй за ўсё ніжнія палосырэфы агіналі ўзвод з двух бакоў, атрымаўшы форму прамакутнага абруча для больш моцнага мацавання ніза ўзвода і, магчыма, для замацавання жалезных шыпоў.

Няясным засталося толькі адно пытанне — ці быў узвод выкананы як крата, ці ён уяўляў сабой шчыльны дубовы шчыт, сплочаны папярочнымі палосамі. Але гэта на механізм дзеяння ўзвода ніяк не ўплывае. Цяпер можна зрабіць пэўную рэканструкцыю.

Узвод падымаўся і апушчаўся праз вялікую шчыліну над уваходам, якую Волкаў лічыць машыкулем. Ланцугі мацаваліся ў ніжняй частцы ўзвода, цягнуліся да гарызантальных папярочных адтулін па абодвух баках зверху праезда.У кожнай адтуліне па дубовым калу, за адзін канец якога мацаваўся ланцуг, а за другі – прут, які звісаў з процілеглага боку адтуліны. Гэта калі ўзвод апушчаны.

Розніца колькасці звёнаў, адзначаная ў інвентарах, звязана з розніцай размяшчэння выхадных адтулін з боку ўзода – правая адтуліна вышэй за левую на адно звяно ланцуга.

Каб падняць узвод, трэба цягнуць за пруты (цяжка, але нехта дапамагае, падцягваючы сам узвод угору), пакуль ланцугі не схаваюцца ў адтулінах. Следам за прутом дубовыя калы выходзяць з адтулінаў. Тады можна пруты апускаць і калы правіснуць з адтулінаў уніз, трыманыя ўверсе ланцугамі. Самі па сабе калы не ўлезуць у адтуліну і будуць надзейна трымаць узвод ва ўзнятым стане. Каб узвод апусціць, дастаткова штурgriнуць за пруты, каб калы прынялі блізкае да гарызантальнага становішча. Узвод сваёй вагой пацягне калы ў адтуліны і раптоўна апусціцца сам.

Застаецца пытанне пра шчыліну, куды ўзвод хаваўся. Шырыня яе 45 см сведчыць аб тым, што ўзвод складаўся з брусоў каля 15-20 см таўшчыні. Акрамя таго, на фотаздымку шчыліны зверху (фота М. Волкава), уздоўж сцен вакол яе відаць гарызантальныя паглыбленні. Яны напэўна прызначаліся для драўлянай рамы, якая забяспечвала цагляную муроўку ад выбоін і заадно дазваляла дапасаваць шчыліну да памераў палатна ўзвода.




*Мал. 8.* ***Разрэз — узвод узняты***

Вельмі арыгінальна вызначаліся памеры канструкцыі. Мернай адзінкай (модулем) тут з'яўляецца даўжыня верхняй гарызантальнай адтуліны. Яна роўная прыблізна рускаму сажэню (217 см). Гэтаму памеру адпавядаў ланцуг пры ўзнятым узводзе. Пад аркай адкрываўся праезд, які па вышыні таксама адпавядаў модулю і быў дастатковы для праезда воза альбо саняў. Коннік павінен быў спешыцца. З дадатнымі прыстасаваннямі ўзвод можна было ўзняць і вышэй за модуль.

Ёсць яшчэ некалькі тэхналагічных дэталей, неабходных для практычнага ажыцяўлення гэтай абарончай прылады. Але я іх тут апускаю, каб не ўскладняць разуменне галоўнай ідэі.

Простае і зручнае рашэнне ўзвода напэўна прыдумаў сам замкавы дойлід, бо ўсе патрэбныя адтуліны і іх памеры былі прадугледжаны загадзя ў часе ўзвядзення ўяздной вежы. Прастата і дасканаласць гэтага рашэння адпавядае ўсёй архітэктуры Мірскага замка. Напрыклад, вельмі прыгожы дэкор вежаў і сцен складаецца выключна з простых па форме, а не складаных профільных цаглін або цясанага каменя.

Загадка дзеяння механізма ўзвода турбавала мяне з самага пачатку даследаванняў замка, г.зн. з пачатку 1970-х гадоў. Тое, што ўзвод быў падаючай кратай тыпу герсы, сумневу не было. Дарэчы, слова «герса» ўжываецца ў рускай спецыяльнай літаратуры, яно французскага паходжання — gerse — барана. У польскай літаратуры гэтае прыстасаванне так і называецца — brona — барана,



*Мал. 9.* ***Фасад — узвод узняты***

а ўзвод (wzwód) тлумачыцца як пад'ёмны мост. Гэта мы ведаем са слоўнікаў, складеных у XIX–XX стст. На самой справе, у тагачаснай рэальнасці існавалі мясцовыя варыяцыі. Менавіта такі выпадак сустрэўся ў апісанні Мірскага замка. І не толькі. У апісанні Полацкага замка таксама тых часоў чытаем «Мост перед вороты в замку у великих ворот мостити и за замком, где узвод бывал».

Блытаніна ў вызначэнні слова «ўзвод» збівала з тропу некаторых навукоўцаў, у выніку нарадзілася тэорыя пад'ёмнага моста. Доўгі час я таксама знаходзіўся ў палоне, толькі іншых навуковых стэрэатыпаў. Яны датычыліся не самога ўзвода, а механізма яго руху. Стварцам стэрэатыпаў, здаецца, быў вядомы французскі рэтаўратар паловы XIX ст. Віале ле Дзюк. Ён выпусціў 10 тамоў трактата з малюнкамі па архітэктуры готыкі, прыклады з якога выкарыстоўваліся іншымі архітэктарамі з усяго свету ў нэагатычных пабудовах і ў псеўдарэстаўрацыі аж да пачатку мінулага стагоддзя.

Прадстаўленыя ў спецыяльнай літаратуры рашэнні механізма падаючай заслоны-герсы зводзіліся ў асноўным да двух тыпаў: з калаўротам ці з процівагамі, і былі даволі складанымі тэхнічна. Спробы тэарэтычна аднавіць калаўрот на Мірскім замку не ўдаліся. На нейкі момант я нават дапушчаў, што процівагай у Мірскім замку маглі служыць неапраўленыя гарматы, згаданыя ў інвентары 1688 г. менавіта ў браме пад вежай. Аднак у прапанаваных рашэннях засмучалі дзве акалічнасці — верагоднасць непажаданага падзення герсы ад нейкага выпадку (напрыклад, саскочыў фіксатар), а таксама слабая магчымасць раптоўнага падзення прылады (асабліва ў варыянце з процівагамі). У рускім варыянце Вікіпедыі на слова «герса», напрыклад, гаворыцца, што для раптоўнасці трэба рубіць стрымліваючы канат.

Прапанаванае зараз мною рашэнне ўзвода сфармавалася толькі пасля настырнай актыўнасці і памылковасці высноў Міколы Волкава. Ягоная алагічнасць прымусіла скрупулёзна прааналізаваць хібы яго тэорый і больш уважліва прагледзець зыходныя рэаліі (даўнія апісанні і натурны агляд). У сувязі з гэтым прыношу вялікую падзяку М. Волкаву за штуршок, вынікам

якога адбылося сапраўднае адкрыццё адной з галоўных загадак Мірскага замка. Асаблівую падзяку прыношу археолагу Алесю Кушнярэвічу за магчымасць азнаямлення з матэрыяламі па раскопках у браме 2010 г.

Падобнай, як прапануецца, канструкцыі падаючага ўзвода ў літаратуры пакуль не знойдзена. Зусім верагодна, што яна была распаўсюджана ў некаторых замках Еўропы, але не захавалася і была заменена пазнейшымі прыдумкамі ў стылі Віале ле Дзюка. Гэтыя абставіны дазваляюць залічыць рашэнне ўзвода Мірскага замка як прыклад унікальнага абарончага прыстасавання позняга сярэднявечча.